ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»

Асвятленне парламенцкіх выбараў 2012 г. у беларускіх СМІ

Бюлетэнь №1

(31 ліпеня – 17 жніўня 2012 г.)

Маніторынг мае на мэце:

-- *ацаніць, наколькі поўна, усебакова і ў адпаведнасці з прынцыпамі журналісцкай этыкі ды міжнародна прызнанымі стандартамі беларускія медыя здольныя асвятляць выбарчы працэс;*

-- *прыцягнуць увагу журналісцкай супольнасці краіны да таго, што неперадузятае і поўнае інфармаванне выбарцаў пра электаральны працэс, а таксама пра палітычныя і грамадскія погляды кандыдатаў і іх прыхільнікаў – непасрэдны абавязак прафесійных медыя;*

-- *прааналізаваць уплыў медыя на электаральны выбар.*

Маніторынг ажыццяўляецца на падставе 17 беларускіх СМІ, дзяржаўных і недзяржаўных, электронных і друкаваных, агульнанацыянальных і рэгіянальных[1]. Аналіз зместу медыя базуецца як на якасных, так і колькасных паказчыках, г. зн. -- на ацэнцы манеры рэпрэзентацыі суб'ектаў выбарчага працэсу і падліку плошчы/часу, адведзеных выбарчай тэматыцы ў, адпаведна, друкаваных і электронных медыя.

Пазначаны вышэй перыяд маніторынгу ахоплівае такія важныя этапы выбарчай кампаніі, як фармаванне ўчастковых камісій і вылучэнне кандыдатаў.

Асноўныя вынікі і некаторыя высновы

У азначаны перыяд дзяржаўныя медыя асвятлялі выбарчы працэс у традыцыйнай манеры -- г.зн., надаючы асвятленню выбараў менш увагі, чым тэмам "Надвор'е" і "Спорт", у якой, відавочна, дамінавалі рэпартажы з алімпійскіх гульняў у Лондане;

Галоўным ньюсмейкерам выбарчай кампаніі ў названых СМІ быў Цэнтрвыбаркам. Што да апазіцыйных палітычных партый, прадстаўнікі якіх бяруць удзел у выбарах, іхняя прысутнасць была мінімальнай. А калі пра іх і заходзіла гаворка, дык дзяржаўныя медыя рэпрэзентавалі іх пераважна ў адмоўным ці надзвычай адмоўным тоне. І ніводнага разу прадстаўнікі апазіцыі, незалежныя эксперты, палітолагі ці прадстаўнікі НДА не мелі голасу ў тых самых медыя.

Назвычай адмоўнай была характарыстыка ролі і дзейнасці заходніх назіральнікаў. То бок манера асвятлення парламенцкай кампаніі (параўнальна з усімі папярэднімі) істотна не

[1] ***Электронныя медыя --*** *Беларусь 1 (навінная праграма "Панарама"); АНТ (навінная праграма "Наши новости"); Беларусь 1 (тыднёвая аналітычная праграма "В центре внимания"); Нацыянальнае радыё, (1 праграма "Радыёфакт"); "ТРК "Гомель" – "Навіны Рэгёна"; "Гомель FM" ("Навіны"); ТРК "Магілёў"("Навіны Магілёў"); Абласное радыё "Навіны" (Магілеў).* ***Інтэрнэт-рэсурсы*** -- www.naviny.by, www.belta.by. ***Друкаваныя СМІ –*** *"Беларусь сегодня", "Народная воля", "7 дней", "Наша ніва", "Комсомольская правда в Белоруссии", "Гомельская праўда", "Могилёвская правда".*

змянілася. Гэту манеру вырознівае аднабаковая падача інфармацыі, негатыўнае партрэтаванне апанентаў рэжыму і заходніх назіральнікаў, відавочная адсутнасць права на адказ ды рэтушаванне поглядаў і ацэнак прадстаўнікоў розных палітычных партый і іх прыхільнікаў. Палярная рэпрэзентацыя ўлады і апазіцыі, назіральнікаў (з краін СНД і заходніх) – яшчэ адна характэрная рыса асвятлення выбарчых кампаній у дзяржаўных СМІ.

Недзяржаўныя медыя падавалі тэму выбараў у відавочна больш шырокім дыяпазоне і не абмяжоўваліся адно афіцыйнай інфармацыяй, што зыходзіла ад ЦВК. Разам з тым, мяркуючы па плошчы, якую недзяржаўная прэса адвяла выбарам, бачна, што гэтая тэматыка яшчэ не стала для іх выразна прыярытэтнай.

Агульнае ўражанне азначанага этапу маніторынгу палягае на тым, што парламенцкія выбары ў Беларусі -- гэта не яркая медыйная падзея, а палітычна-рытуальная дзея з наступствамі, якія няцяжка прадказаць.

Электронныя медыя і інтэрнэт-выданні

Як адзначалася вышэй, дзяржаўныя электронныя медыя сканцэнтравалі сваю ўвагу на дзейнасці ЦВК, прадстаўнікі якой былі галоўнай крыніцай інфармацыі адносна фармавання камісій, стварэння ініцыятыўных груп і вылучэння патэнцыйных кандыдатаў. Вось адно з выказванняў прадстаўніка ЦВК сп. Лазавіка: *“Я проанализировал выдвижение представителей в состав участковых комиссий по одному лишь 49 избирательному округу города Гродно. Объединенная гражданская партия для включения в участковые избирательные комиссии этого округа представила 18 кандидатур. Когда мы проанализировали, что ж это за граждане, оказалось, что из 18 -- 10 привлекались к уголовной и административной ответственности, 9 – нигде не работающие. Каким уважением, каким авторитетом пользуются эти люди среди избирателей? (...) И таким людям просто не место в избирательных комиссиях”* (*Беларусь 1 “В центре внимания” – 12.08.2012*).

Дзяржаўныя электронныя медыя шырока пазнаёмілі сваіх гледачоў і чытачоў з наступнымі выказваннямі Прэзідэнта датычна апазіцыі: *“Если бы сегодня наша, ну, оппозицией ее трудно назвать, но, наверное, там есть кто-то оппозиционно настроенный… ну вот, пятая колонна с оппозицией чувствовали, что они победят, они б никогда не говорили, что выборы не легитимные, ибо тогда и вы будете не легитимные. А раз так говорят, значит, они понимают, что в данной ситуации они пролетят, как фанера над Парижем… Ну а какую они там тактику изберут – это их мышкование. Их мышкование связано, поверьте, только с одним – другого, третьего нет: получить деньги. Хоть маленькие – сейчас Запад уже мало им дает – но хотя бы это на существование и для того, чтоб бензин купить на те автомобили, которые тоже Запад помог им купить, и особняки, которые они когда-то построили, обещая Западу, что они власть возьмут в Беларуси – Запад им дал большие деньги – они построили особняки – сегодня их надо содержать. Вот хотя бы эту долю им дал Запад – они готовы тут шуметь, кричать, взрывать, стрелять – что угодно делать – это их политика. (...) Все те же лица – замызганные, замусоленные, которые ездили и предавали страну. И травили народ”* (*Беларусь 1, “Панарама” -- 09.08.2012*).

Вызначанай выглядае і функцыя заходніх назіральнікаў: *“Пригласили, как вы видите, всех этих надсмотрщиков, кто был и кто не был у нас – пусть смотрят. Мы знаем, что они напишут, мы уже первые доклады и информацию получаем их – еще выборов нет, а мы уже прочитали. Мы принимали сознательное решение. Мы знаем, что они будут нас*

долбать, клепать, -- как бы мы ни провели эти выборы” (*Беларусь 1, “Панарама”-- 09.08.2012*).

Негатыўна дзяржаўныя тэлеканалы ацанілі ролю кіраўніка місіі назіральнікаў ПА АБСЕ: *“Маттео Мекаччи – итальянский политик радикального толка. В своей стране выступает не столько за свободу слова, сколько высказывается за легализацию проституции, педофилии в интернете и лёгких наркотиков. Взгляды Мекаччи осуждает большая часть итальянского общества. Что касается отношения к Беларуси, то судя по прежним заявлениям и призывам к ужесточению санкций, оно явно предвзятое. Вместо объективной оценки итальянский депутат склонен выдавать желаемое на Западе за действительное” (АНТ “Наши новости” – 15.08.2012).*

Сярод рэпрэзентаваных суб’ектаў выбарчага працэсу на дзяржаўных тэлеканалах дамінуюць Прэзідэнт, ЦВК і апазіцыя, якая падаецца ў выключна адмоўным тоне. У праграме *“Наши новости” АНТ* час, адведзены розным суб’ектам, размеркаваўся так: Прэзідэнт -- 59%, ЦВК – 10,5%, неперсаніфікаваны кандыдат – 8%, апазіцыя – 6,5%. Астатнія 11 суб’ектаў атрымалі часу ў межах ад 3% да 0,15%. Прыкладна такая ж карціна характэрная і для іншых дзяржаўных электронных медыя з той толькі розніцай, што названыя суб’екты могуць мяняцца месцамі ў адпаведнасці з адведзеным ім часам ці колькасцю знакаў у інтэрнэт-рэсурсах. А рэгіянальныя дзяржаўныя медыя больш часу адводзілі дзейнасці акруговых і ўчастковых камісій.

Недзяржаўнае электроннае выданне *www.naviny.by* падало значна шырэйшы спіс удзельнікаў выбарчага працэсу. *Naviny.by* пісалі пра 33 суб’екты выбарчага працэсу (для параўнання: belta.by пісала пра 17 суб’ектаў). Да таго ж, названы недзяржаўны сайт рэгулярна знаёміць сваіх чытачоў з меркаваннямі палітыкаў, экспертаў і аналітыкаў датычна выбарчага працэсу.

Друкаваныя СМІ

Што да асвятлення выбарчага працэсу маніторынгаваныя друкаваныя медыя істотна саступаюць электронным СМІ. Напрыклад, газета *“Беларусь сегодня”* фактычна абмежавалася афіцыйнай інфармацыяй ЦВК (1 632 см. кв.). Газета *“7 дней”* з трох маніторынгаваных нумароў толькі ў адным з іх падала нязначную інфармацыю ЦВК (438 см. кв.) і зусім не пісала пра іншых суб’ектаў. Недзяржаўная *“Комсомольская правда в Белоруссии”* (таўстушка) увогуле не пісала пра выбары.

“Народная воля” рэпрэзентавала дзейнасць 11 суб’ектаў, а тыднёвік *“Наша ніва”* – 6. Дзейнасць ЦВК і ўчастковых камісій *“Народная воля”* ацаніла нестаноўча. Пра апазіцыю, электарат ды іншых суб’ектаў пісала ў нейтральным тоне. Рух “За Свабоду” быў рэпрэзентаваны як негатыўна, так і нейтральна. Выключна нейтральнага тону датычна усіх рэпрэзентаваных ёй суб’ектаў трымалася *“Наша ніва”.*

Рэгіянальная дзяржаўная прэса адвяла выбарчай тэматыцы зусім нязначную плошчу *(“Могилёвская правда”* – 395 см. кв. і *“Гомельская праўда”* – 491 см. кв.).


Гэткім чынам, калі параўнаць асвятленне цяперашняй парламенцкай кампаніі з аналагічнай кампаніяй 2008 г., яно пакуль нічым істотным не адрозніваецца. Больш за тое, выглядае руцінным і пазбаўленым хоць якой сапраўднай драматургіі.


BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

BELTA.BY

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - колькасьць знакаў







BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

ТРК "Магілёў"/Абласное радыё "Навіны"

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

ТРК “Магілёў”/Абласное радыё “Навіны”

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)





BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

“Могилёвская Правда”

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - см. кв.







BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

NAVINY.BY

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - колькасьць знакаў







BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

"Народная Воля"
31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - см. кв.







BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

ОНТ НАВІНЫ

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

ОНТ НАВІНЫ

30.07 - 20.08.2012

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)





BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

Панарама

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

Панарама

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)



BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2012

“Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”

31.07 - 17.08.2012

Адзінка вымярэння - см. кв.

